*В.У. Галубовіч (Полацкі дзяржаўны універсітэт, Наваполацк)*

# АСОБА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У АСВЯТЛЕННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

З апошняга дзесяцігоддзя XX ст. асоба нябеснай патронкі Беларусі Еўфрасінні Полацкай стала прыцягвае ўвагу грамадскасці і гісторыкаў. З кожным годам павялічваецца колькасць публікацый, вяртаюцца з забыцця прысвечаныя ёй працы і, нарэшце, у Полацку ўрачыста адкрыты помнік першай асветніцы Беларусі. Так было не заўсёды. Сёння нават цяжка ўявіць падручнік па гісторыі Беларусі для ВНУ і школы без згадкі пра Еўфрасінню Полацкую. Аднак у айчыннай гісторыі быў перыяд, калі пра яе імя імкнуліся забыцца. Памятаць пра гэта трэба, каб такая гісторыя не паўтарылася зноў.

Мэтай дадзенай публікацыі з'яўляецца спроба прасачыць, як эвалюцыянавалі падыходы да асвятлення ролі асобы Еўфрасінні Полацкай у найбольш значных сінтэзных працах айчынных гісторыкаў па гісторыі Беларусі.

Спробы напісання абагульняючай гісторыі Беларусі адносяцца яшчэ да сярэдзіны XIX ст. Першай сінтэзнай з іх прызнаецца «Агляд гісторыі Беларусі са старажытных часоў» В. Турчыновіча[1]. Тагачасны ўзровень гістарычнай навукі выяўляецца ў адсутнасці ў аўтара цікавасці да праблем гісторыі культуры ўвогуле і асобы Еўфрасінні Полацкай у прыватнасці. Не зацікавіўся асветніцай і М. Каяловіч, хаця яго «чытанні» увогуле вельмі цяжка непасрэдна дапасоўваюцца да

гісторыі Беларусі[2]. Толькі згадваецца (с. 328) імя Св. Еўфрасінні і ў нарысе А. Кіркора, прысвечаным развіццю асветы, у трэцім томе вядомага выдання П. Сямёнава-Цян-Шанскага[3].

Паўнавартаснае асвятленне жыццядзейнасці Еўфрасінні Полацкай знайшло адлюстраванне хіба толькі ў выдадзенай П. Бацюшкавым у 1890 г. кнізе «Беларусь і Літва»[4]. Першая глава згаданай кнігі «Паўночна-Заходняя Русь пад уладай рускіх князёў» утрымлівае біяграфію Св. Еўфрасінні. Пазней гэты матэрыял быў цалкам перадрукаваны А. Турцэвічам у «Хрэстаматыі па гісторыі Заходняй Расіі»[5].

Цікава, што ў першай беларускамоўнай гісторыі Беларусі, выдадзенай у 1910 г. В. Ластоўскім, Еўфрасіння Полацкая не згадваецца ўвогуле[6]. Магчыма, гэта адбылося з-за празмернай увагі аўтара да палітычных падзей. Тым не менш, пазней у «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» В. Ластоўскі падрабязна ахарактарызаваў жыццяпіс Св. Еўфрасінні і «помнік крыўскай культуры XII ст.» – крыж Еўфрасінні Полацкай[7].

Найбольш пашыранай у 1920-я гады сінтэзнай гісторыі Беларусі, якая вытрымала да 1926 г. чатыры выданні, стаў «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» У. Ігнатоўскага[8]. Аўтар вылучыў у «Першым перыядзе» беларускай гісторыі пункт «Хрысціянства і асвета», дзе даў характарыстыку прадстаўнікоў «кніжнай асветы», у тым ліку Еўфрасінні Полацкай. Асноўную ўвагу У. Ігнатоўскі надаваў такому аспекту дзейнасці прападобнай, як перапісванне кніг. Ігнатоўскі вельмі слушна падкрэсліў: «Праца Еўфрасіньні была, такім спосабам, тым дапаўненьнем да працы вучоных, без якога навука ня можа стаць культурным набыткам шырокага кола грамадзянства»[9]. Хаця ў нарысе нічога не паведамляецца пра фундатарскі аспект дзейнасці Еўфрасінні Полацкай і замову крыжа ў Лазара Богшы, У. Ігнатоўскі акрэсліў унёсак полацкай святой у развіццё айчыннай культуры як вельмі істотны. Няма ў яго кнізе і адцення адмоўнага ці заідэалагізаванага стаўлення да Еўфрасінні.

Не абыйшоў увагай жыццядзейнасць асветніцы і знакаміты беларускі гісторык М. Доўнар-Запольскі. У падрыхтаванай да друку яшчэ ў 1920-я гады, але выдадзенай толькі ў 1994 г. «Гісторыі Беларусі»[10], аўтар, папярэдне адзначыўшы, што «найменш нам вядома пра літаратурныя посьпехі ў Полацку»[11], значна падрабязней, чым У. Ігнатоўскі і бліжэй да зместу «Жыція», распавядае пра Еўфрасінню Полацкую. Доўнар-Запольскі крытычна ставіўся да некаторых момантаў біяграфіі асветніцы. Так, напрыклад, ён прытрымліваўся думкі, што Еўфрасіння Полацкая памерла ў час падарожжа ў Кіеў, а не ў Іерусалім[12]. У цэлым можна адзначыць, што ніводная абагульняючая праца па гісторыі Беларусі да 1990-х гадоў аб'ёмам і якасцю інфармацыі пра Еўфрасінню Полацкую не пераўзыходзіць «Гісторыю Беларусі» М. Доўнар-Запольскага.

1930-я гады адзначаны ў развіцці айчыннай гістарыяграфіі як час яе паступовай дэградацыі. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца адзіная сінтэзная гісторыя Беларусі, падрыхтаваная і выдадзеная дзесяцітысячным накладам у 1934 г. В. Шчарбаковым[13].

У 1940 г. лацінкай у Вільні, а ў 1944 і 1993 г. кірыліцай у Мінску выдадзены папулярны нарыс гісторыі Беларусі Я. Найдзюка «Беларусь учора і сяньня»[14], які ўтрымлівае звесткі пра Св. Еўфрасінню[15].

У першы пасляваенны перыяд існавання беларускай савецкай гістарыяграфіі (другая палова 1940-х – пачатак 50-х гадоў) выявілася тэндэнцыя да вяртання шэрагу асоб у айчынную гісторыю. Значную цікавасць уяўляе першая частка «Гісторыі БССР», аддрукаваная ў 1948 г. у колькасці 150 асобнікаў і пазначаная грыфам «Макет. На правах рукапісу»[15]. Выданне, якое ахоплівае перыяд да XVIII ст., было падрыхтавана супрацоўнікамі Інстытута гісторыі АН БССР у якасці аднаго з варыянтаў запатрабаванай на той час сінтэзнай гісторыі БССР.

У кнізе няма асобнай главы, дзе б разглядаліся пытанні культуры Беларусі XI–XIII стагоддзяў, хаця, для параўнання, вылучаюцца асобныя главы для культуры Беларусі XIV–XVI стст. (глава VIII) і XVII–XVIII стст. (глава IX). Культурныя працэсы на беларускіх землях у XI–XIII стст. разглядаюцца толькі ў пунктах 13 «Распаўсюджванне хрысціянства і арганізацыя царквы» і 14 «Культура і асвета». У кнізе станоўча ацэньваецца роля хрысціянства на Русі ў XI–XIII стст., што дазволіла аўтарам падрабязней спыніцца на жыццядзейнасці шэрагу выдатных асветнікаў таго часу. Найбольш месца адводзіцца Кірылу Тураўскаму. У невялічкім абзацы згадваецца і Еўфрасіння Полацкая, якая выступае ў якасці «сучасніцы Кірыла Тураўскага». Адносна стрымана паведамляецца, што Еўфрасіння «яшчэ ў маладосці пайшла ў манастыр. Троху пазней яна заснавала каля Полацка два новых манастыры. У адным з іх яна ўладкавала школу для падрыхтоўкі царкоўна-служачых. У манастыры Еўфрасіння займалася перапісваннем царкоўных кніг, чым садзейнічала распаўсюджванню тагачаснай царкоўнай адукаванасці. Акрамя гэтага, яна навучала манашак грамаце і рукадзеллю»[17]. Згадваецца таксама пра крыж Еўфрасінні Полацкай[18]. Але нават такая сціплая інфармацыя пра знакамітую асветніцу стала незапатрабаванай у пазнейшых сінтэзных працах па гісторыі БССР.

Выразна гэтая тэндэнцыя выявілася ўжо ў афіцыйным (накладам 20 000 асобнікаў) выданні першага тома «Гісторыі БССР» 1954 г. пад рэдакцыяй У. Перцава, К. Шабуні і Л. Абэцэдарскага[19]. Падзеі гісторыі Беларусі ў першым томе даведзены да 1917 г. У трэцяй главе тома «Феадальная раздробленасць XII–XIV стст.» вылучаецца пункт 8 «Культура перыяду феадальнай раздробленасці» (с.61–65), дзе нават Кірыла Тураўскі характарызуецца толькі як «тыповы» прадстаўнік

царкоўнай літаратуры. Асоба Еўфрасінні Полацкай увогуле выпала з поля зроку аўтараў кнігі. У гэтым выданні абыходзіцца роля Еўфрасінні нават у стварэнні знакамітага крыжа, які «належаў Спаса-Ефрасіньеўскаму манастыру» і быў створаны Лазарам Богшам, «працаваўшым пры двары полацкіх князёў»[20].

У крыху зменемым перавыданні гэтай «Гісторыі БССР», якое выйшла ў 1961 г. накладам 10 000 асобнікаў[21], працягвалася практыка замоўчвання ролі Еўфрасінні Полацкай у развіцці культуры і асветы Полацкай зямлі. Фундатарскія ініцыятывы асветніцы фактычна прыпісваюцца асноўным выканаўцам яе пачынанняў: злотніку Лазару Богшу і дойліду Іаану[22]. У цэлым два апошнія выданні вызначае выразная дыспрапорцыя паміж выкладаннем матэрыялу па матэрыяльнай культуры, які дамінуе, і асвятленнем працэсу развіцця духоўнай культуры.

Найбольшым дасягненнем беларускай савецкай гістарыяграфіі з'явілася фундаментальная 5-цітамовая «Гісторыя Беларускай ССР», першы том якой накладам 5000 асобнікаў выйшаў у 1972 г.[23] Пункт 5 першага тома «Культура заходніх зямель Русі» (с. 130–141; аўтары – М. Грынблат і В. Тарасенка), які ўвайшоў у VI раздзел «Палітычнае жыццё і культура заходніх зямель Русі ў IX – першай палове XIV ст.», істотным чынам павялічаны і пазбаўлены абмежаванасці папярэдніх савецкіх выданняў, але і тут аўтары ў цэлым абмінаюць асобу святой Еўфрасінні. Тым не менш, заслугоўвае ўвагі, што ўпершыню ў сінтэзнай працы, пачынаючы з 1926 г., калі не ўлічваць выйшаўшай малым накладам у 1948 г. «Гісторыі БССР», фігуравала імя Еўфрасінні Полацкай[24].

Канчатковае вяртанне імя прападобнай на старонкі абагульняючых прац засведчвае аднатомная «Гісторыя Беларускай ССР», выдадзеная адносна вялікім для БССР накладам 25 000 асобнікаў у 1977 г.[25] У выданні адзначана: «Вялікую ролю ў распаўсюджванні пісьменнасці і адукаванасці адыгралі Полацк і Тураў. Перапісваннем царкоўных кніг займалася Еўфрасіння Полацкая»[26].

Мала чым адрозніваецца ад папярэдняй інфармацыя пра святую, якая змешчана ў першым навучальным дапаможніку па курсу гісторыі БССР (наклад 8000 асобнікаў) для універсітэтаў і педагагічных інстытутаў пад рэдакцыяй В. Чапко і А. Ігнаценкі[27]. Асветніцы тут адведзены адзін сказ, з якога можна даведацца пра тое, што ўнучка полацкага князя Усяслава Еўфрасіння займалася перапісваннем кніг[28]. З кантэксту можна толькі здагадвацца, якія кнігі перапісвала ўнучка знакамітага князя. Нават у другой палове 1980-х гадоў асоба Еўфрасінні Полацкай не з'яўлялася прадметам спецыяльнага зацікаўлення гісторыкаў. Гэта выразна прасочваецца ў другім абагульняючым выданні нарыса гісторыі Полацка[29]. Аўтары вылучаюць толькі тое, што давала «Жыціе» Св. Еўфрасінні як крыніца па полацкай гісторыі XII ст.

Апошняе дзесяцігоддзе мінулага XX ст. у значнай ступені можна разглядаць як своеасаблівы рэнесанс айчыннай гістарыяграфіі. Паўплывала на гэта і дзейнасць беларускай эміграцыі, якая не забывалася на свае святыні[30]. За гэты час з'явілася болей абагульняючых гісторый Беларусі, чым за XIX і XX стст. разам узятыя.

Найбольш значнай сінтэзнай гісторыяй Беларусі 1990-х гадоў з'яўляюцца падрыхтаваныя супрацоўнікамі Інстытута гісторыі айчыннай Акадэміі навук «Нарысы гісторыі Беларусі», першая частка якіх была выдадзена ў 1994 г., прычым накладам 40 000 асобнікаў[31]. Радыкальныя змены ў беларускім грамадстве і магчымасць звяртацца да забароненых раней тэм паўплывалі на характар «Нарысаў», якія ў значнай ступені адлюстроўваюць нацыянальную канцэпцыю айчыннай гісторыі. Упершыню ў акадэмічным выданні, разлічаным на настаўнікаў, навукоўцаў, студэнтаў і іншых, было дастаткова падрабязна і па-навуковаму стрымана ахарактарызавана жыццё і дзейнасць полацкай асветніцы. Да адметнасцяў «Нарысаў» неабходна аднесці тое, што сярод дзеячаў культуры XII ст. аўтары другога раздзела (Г. Штыхаў і Т. Каробушкіна) спачатку спыніліся менавіта на асобе Еўфрасінні Полацкай[32]. Не толькі ў У. Ігнатоўскага і М. Доўнар-Запольскага, але і ў некаторых сучасных сінтэзных гісторыях Беларусі, Св. Еўфрасіння выступае ў цені Клімента Смаляціча і Кірылы Тураўскага[33].

У шматлікіх выданнях гісторыі Беларусі гэтага часу асоба Еўфрасінні прысутнічала абавязкова. Адрозніваюцца кнігі толькі аб'ёмам інфармацыі. Так, «Гісторыя Беларусі» (наклад 6000 асобнікаў) пад рэдакцыяй А. Ігнаценкі і Я.Несцяровіча[34] паведамляе ў невялікім абзацы толькі пра адносіны полацкай святой да перапісвання кніг і, магчыма, да стварэння арыгінальных твораў, у тым ліку летапісаў[35]. Дзіўна выглядае ў дадзенай кнізе тое, што праблемы культуры разглядаюцца ў пункце «Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем татар» (с. 16–23). Значна больш інфарматыўнай з'яўляецца «Гісторыя Беларусі» (наклад 5000 асобнікаў), падрыхтаваная калектывам аўтараў і выдадзеная ў 1994 г. у Гродне[36]. У «Гісторыі Беларусі» пад рэдакцыяй А. Каханоўскага (наклад 10 000 асобнікаў) [37] біяграфія Еўфрасінні Полацкай не ўзнаўляецца, але згадваецца, што кніжная культура дасягнула сваіх вышынь у творчасці асветніцы і менавіта яна замовіла ў Лазара Богшы крыж, надпіс на якім перадаецца ў дадатках да пункта «Рэлігія і культура»[38].

Толькі ў сувязі з распаўсюджваннем на беларускіх землях у XI–XIII стст. агіяграфічнай літаратуры і ўсё з тым жа крыжам выступае Еўфрасіння ў «Гісторыі Беларусі» І. Коўкеля і Э. Ярмусіка (наклад 10 000 асобнікаў)[39]. Значнасць яе асобы, паводле выразу аўтараў «*занимающейся переписыванием книг*» (с. 17), для айчыннай гісторыі і культуры спецыяльна не акрэсліваецца. Біяграфічныя звесткі

пра Прадславу-Еўфрасінню ўвайшлі ў «Гісторыю Беларусі» пад рэдакцыяй Я. Новіка і Г. Марцуля (наклад першага выдання 10 000 асобнікаў)[40], а таксама ў курс лекцый па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст., першая частка якога накладам 3200 асобнікаў выйшла з друку ў 2000 г.[41] Адметнасць апошняй кнігі ў тым, што тут пазначаны дзень памяці Еўфрасінні Полацкай (23 траўня), які адзначаецца царквой[42]. Ніякіх канкрэтных дадзеных пра святую няма ў «Нарысах гісторыі Беларусі» П. Чыгрынава (наклад 6000 асобнікаў)[43]. Аўтар спачатку вылучыў Еўфрасінню Полацкую, адзначыўшы, што яна была «*незаурядной представительницей культурно-просветительского движения*», а потым далучыў яе да «*многих христиан-пилигримов, потянувшихся из Европы на Ближний Восток во время крестовых походов с целью приобщиться к христианским святыням*»[44]. На жаль, у прыведзеных працах не адзначаецца такі істотны аспект, як выразны полацкі патрыятызм аўтара «Жыцця Еўфрасінні»[45].

Найбольш усеабдымна і падрабязна жыццядзейнасць полацкай святой знайшла адлюстраванне ў главе 4 «Культура. Вытокі беларускага этнасу» першага тома шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» (наклад 10 000 асобнікаў), падрыхтаванай супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі[46]. У кнізе вылучаецца асобны пункт «Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі» (аўтар М. Гурын)[47]. Аўтар распачаў выкладанне матэрыялу з Еўфрасінні Полацкай і прысвяціў ёй другую пасля Кірылы Тураўскага колькасць старонак, гэтым самым засведчыўшы яе ролю ў культуры Беларусі. Не абмінае асобы полацкай асветніцы і Г. Сагановіч у найноўшым па часе выдання «Нарысе гісторыі Беларусі» (наклад 3000 асобнікаў)[48].

Такім чынам, ужо ў першых абагульняючых працах беларускія гісторыкі (У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі) паставілі Св. Еўфрасінню ў шэраг выдатных асоб айчыннай гісторыі. Ва ўмовах барацьбы з рэлігіяй у БССР у 1930 – 80-я гады асвятленне жыццядзейнасці Еўфрасінні Полацкай у акадэмічных выданнях не было магчымым. Толькі з апошняга дзесяцігоддзя XX ст. жыццядзейнасць асветніцы з рознай ступенню падрабязнасці асвятляецца ў сінтэзных працах па беларускай гісторыі.

## ЛІТАРАТУРА:

1 Турчинович О. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времён. СПб., 1857.
2 Коялович М.О. Чтения по истории Западной России. СПб., 1872.
3 Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. Мн., 1993.
4 Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. СПб., 1890.
5 Турцевич А. Хрестоматия по истории Западной России: Учебное пособие для учеников старших классов средних учебных заведений. Вильно, 1892.

6 Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910; Мн., 1992.
7 Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1926.
8 Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991.
9 Там жа. С. 55.
10 Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
11 Там жа. С. 49.
12 Там жа. С. 52.
13 Шчарбакоў В. Нарыс гісторыі Беларусі.Ч.І. Мн., 1934.
14 Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.
15 Там жа. С. 27.
16 История БССР.Ч. І. Мн., 1948.
17 Там жа. С. 107.
18 Там жа. С. 109.
19 История Белорусской ССР.Т. І. Мн., 1954.
20 Там жа. С. 63.
21 История Белорусской ССР.Т І. Мн., 1961.
22 Там жа. С. 75, 77.
23 Гісторыя Беларускай ССР.Т 1. Мн., 1972.
24 Там жа. С. 137.
25 История Белорусской ССР. Мн., 1977.
26 Там жа. С. 38.
27 История БССР.Ч.1. Мн., 1981.
28 Там жа. С. 64.
29 Полоцк: Ист. очерк. Мн., 1987.
30 Рагач П. Кароткі агляд гісторыі Беларусі. Кліўленд–Нью-Ёрк–Талін, 1990.
31 Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. Ч. 1. Мн., 1994.
32 Там жа. С. 109.
33 Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытнасці па люты 1917 г. Мн., 1998.
34 Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
35 Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 22.
36 Коўкель І.І., Крэнь І.П., Палуцкая С.В., Сяльвестрава С.Я., Фёдараў І.Л. Гісторыя Беларусі. У 3-х ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да пачатку XIX стагоддзя. Гродна, 1994.
37 Гісторыя Беларусі. Мн., 1996.
38 Гісторыя Беларусі. Мн., 1996. С. 63-64.
39 Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. Мн., 1998.
40 Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытнасці па люты 1917 г. Мн., 1998.
41 Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытнасці да канца XVIII ст. Курс лекцый. Мн., 2000.
42 Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытнасці да канца XVIII ст. Курс лекцый. Мн., 2000. С. 183.
43 Чигринов П.Г. Очерки истории Беларуси: Учеб. пособие для вузов. Мн., 2000.
44 Чигринов П.Г. Очерки истории Беларуси: Учеб. пособие для вузов. Мн., 2000. С. 44.
45 Арлоў У. Еўфрасіння Полацкая. Мн., 1992. С. 211.
46 Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мн., 2000.
47 Там жа. С. 313-323.
48 Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст. Мн., 2001.